Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь

Беларуская мова і літаратура

7 *клас*

Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне

2012 / 2013

навучальны год

Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь

Беларуская мова і літаратура

7 клас

Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне

Дапаможнік для настаўнікаў
устаноў агульнай сярэдняй адукацыі

*Рэкамендавана
Навукова-метадычнай установай
«Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь*

Мінск
Нацыянальны інстытут адукацыі
«АВЕРСЭВ»
2012

УДК 373.5.016:811.161.3+821.161.3.09
ББК 74.268.0(4Беи)
В15

Серыя заснавана ў 2006 годзе

Валочка, Г. М.

В15 Беларуская мова і літаратура. 7 кл. : прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі / Г. М. Валочка, С. А. Язерская, Т. У. Логінава. — Мінск : НІА : Аверсэў, 2012. — 46 с. — (Бібліятэка настаўніка).

ISBN 978-985-559-103-1 (НІА)
ISBN 978-985-19-0155-1 (АВЕРСЭВ)

УДК 373.5.016:811.161.3+821.161.3.09
ББК 74.268.0(4Беи)

Вучэбнае выданне

БІБЛІЯТЭКА НАСТАЎНІКА

Валочка Ганна Міхайлаўна
Язерская Святлана Анатольеўна
Логінава Таццяна Уладзіміраўна

БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА

7 клас

Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне

Дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі

Адказны за выпуск *Д. Л. Дэямбоўскі*

Падпісана ў друк 17.05.2012. Фармат 60×84 1/16. Папера друкарская.
Друк афсетны. Ум.друк.арк. 2,79. Ул.-выд. арк. 1,85. Тыраж 3100 экз. Заказ 3929.

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
ЛИ № 02330/0494469 ад 08.04.2009.
Вул. Караля, 16, 220004, Мінск.

Таварыства з дадатковай адказнасцю «Аверсэў».
ЛИ № 02330/0003944 ад 03.02.2009. Вул. М. Олешава, 1, офіс 309, 220090, Мінск.
E-mail: info@aversev.by; www.aversev.by
Кантактныя тэлефоны: (017) 268-09-79, 268-08-78.
Для пісьмаў: а/с 3, 220090, Мінск.

УПП «Віцебская абласная друкарня».
ЛП № 02330/0494165 ад 03.04.2009.
Вул. Шчарбакова-Набярэжная, 4, 210015, Віцебск.

ISBN 978-985-559-103-1 (НІА)
ISBN 978-985-19-0155-1 (АВЕРСЭВ)

© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2012
© Афармленне. ТДА «Аверсэў», 2012

Прадмова

Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне распрацавана ў адпаведнасці з праграмамі па беларускай мове і літаратуры для 7-х класаў, зацверджанымі Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у 2012 годзе. У планаванні рэалізуюцца патрабаванні адукацыйнага стандарту па прадмеце, вызначаецца паслядоўнасць урокаў, у тым ліку і ўрокаў развіцця маўлення і пазакласнага чытання.

У аснову планавання ўрокаў беларускай мовы пакладзены сістэмна-функцыянальны, камунікатыўна-дзейнасны і лінгвакультуралагічны падыходы, а таксама прынцып сістэматычнага паўтарэння і паглыблення ведаў вучняў, які прадугледжвае зварот да пройдзенага ў папярэдніх класах.

Планаванне па беларускай літаратуры прапануе размеркаванне вучэбнага матэрыялу (у адпаведнасці са зместам і структурай праграмы і вучэбнага дапаможніка) па раздзелах, у кожным з якіх — свае пазнавальныя, дыдактычныя, выхаваўчыя задачы.

Выданне мае на мэце дапамагчы настаўніку ў наладжванні навучальнага працэсу, але не павінна стрымліваць яго ініцыятыву і творчы падыход да выкладання прадмета. Настаўнік можа размеркаваць вучэбны матэрыял па-іншаму, улічваючы асаблівасці кожнага класа.

Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне падрыхтавалі:
Беларуская мова. 7-ы клас — Г. М. Валочка, С. А. Язерская.
Беларуская літаратура. 7-ы клас — Т. У. Логінава.

Беларуская мова
7 клас

(70 гадзін на год; 2 гадзіны на тыдзень, з іх 14 гадзін — на пісьмовыя работы)

Размеркаванне вучэбнага матэрыялу прыводзіцца ў адпаведнасці са зместам і структурай вучэбнага дапаможніка: Валочка, Г. М. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 7-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, С. А. Язерская. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2009. — 256 с.

Нумар урока і дата правядзення	Тэма раздзела, урока	Мэты і задачы ўрока	Матэрыял вучэбнага дапаможніка, дамашняе заданне
1	2	3	4
I чвэрць (16 урокаў) Валоданне літаратурнай мовай — асноўны паказчык культуры чалавека (1 гадзіна)			
1	Нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Маўленчы этыкет	Садзейнічаць сістэматызацыі і замацаванню ведаў вучняў пра нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Выпрацоўваць уменне ствараць і запісваць тэксты, выпраўляць памылкі ў адпаведнасці з нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы	§ 1, практ. 1 (падбор прыкладаў на ілюстраванне нормаў беларускай літаратурнай мовы), практ. 2—6 **Д/з**: § 1, практ. 7
Паўтарэнне вывучанага ў 5—6 класах (3 гадзіны)			
2	Тэкст, стылі і тыпы маўлення	Паглыбіць і сістэматызаваць веды вучняў пра тэкст, яго стылі і тыпы, тэму і асноўную думку,	§ 2, практ. 8—11, 13, 14 **Д/з**: § 2, практ. 15

1	2	3	4
		спосабы і сродкі сувязі сказаў у тэксце. Замацоўваць уменне адрозніваць тэксты розных стыляў і тыпаў, даваць характарыстыку тэксту, абгрунтоўваць яго прыналежнасць да пэўнага стылю і тыпу; удасканальваць уменне ствараць тэксты на прапанаваную тэму	
3	Назоўнік, прыметнік, займеннік, лічэбнік, дзеяслоў як часціны мовы, іх граматычныя прыметы	Паўтарыць граматычныя прыметы вывучаных часцін мовы; удасканальваць уменне знаходзіць у тэксце назоўнікі, прыметнікі, лічэбнікі, займеннікі, дзеясловы, вызначаць іх сэнсава-граматычную ролю, абгрунтоўваць выбар моўных сродкаў. Замацоўваць уменне рабіць граматычны разбор часцін мовы. Садзейнічаць удасканаленню арфаграфічных навыкаў, узбагачэнню слоўнікавага запасу вучняў	§ 3 («Успомнім»), практ. 16, 18, 22, 24, 26 (вусна), марфалагічны разбор назоўнікаў, прыметнікаў, займеннікаў, лічэбнікаў, дзеясловаў **Д/з**: § 3, практ. 19
4	Будова слова. Словаўтварэнне вывучаных часцін мовы	Сістэматызаваць веды вучняў па асноўных пытаннях будовы слова і словаўтварэння. Удасканальваць уменне адрозніваць аднакаранёвыя словы і формы аднаго і таго ж слова, дзяліць словы па саставе, вызначаць і характарызаваць спосаб іх утварэння; рабіць словаўтваральны разбор	§ 4 («Успомнім»), практ. 29–31, 34; падбор слоў па прапанаваных графічных схемах **Д/з**: § 4, практ. 32 (марфемны разбор слоў)
Дзеепрыметнік (14 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пісьмовыя работы)			
5	Дзеепрыметнік як асобая форма дзеяслова: агульнае значэнне, марфала-	Садзейнічаць асэнсаванню вучнямі дзеепрыметніка як асобай формы дзеяслова, яго марфалагічных прымет і сінтаксічнай ролі. Фарміраваць уменне прымяняць веды пра дзеяслоў	§ 5, практ. 35, с. 22–23 (правіла), 36–39, 42 **Д/з**: § 5, практ. 43

1	2	3	4
	гічныя прыметы, сінтаксічная роля	і прыметнік для выяўлення прымет дзеепрыметніка, знаходзіць дзеепрыметнікі ў тэкстах, адрозніваць іх ад прыметнікаў. Пазнаёміць са стылістычнай функцыяй дзеепрыметніка	
6	Скланенне поўных дзеепрыметнікаў, правапіс іх склонавых канчаткаў	Пазнаёміць вучняў са скланеннем дзеепрыметніка. Садзейнічаць фарміраванню ўмення правільна дапасоўваць дзеепрыметнікі да назоўнікаў, якія яны паясняюць; выпрацоўваць навык правільнага напісання канчаткаў дзеепрыметнікаў	§ 6, практ. 44, 45, 48, 49 **Д/з:** § 6, практ. 50
7 8	Дзеепрыметнікавы зварот, знакі прыпынку	Паўтарыць будову словазлучэння. Садзейнічаць фарміраванню ў вучняў паняцця пра дзеепрыметнікавы зварот, асэнсаванню яго сінтаксічнай ролі. Выпрацоўваць практычнае ўменне знаходзіць дзеепрыметнікі і дзеепрыметнікавыя звароты ў тэкстах, вызначаць іх межы, правільна інтанаваць і ўжываць у маўленні	§ 7, практ. 52—54, матэрыял для азнаямлення, правіла, практ. 55 (2—3 сказы), 56; 58, 59, 62, 64 **Д/з:** § 7, практ. 57; 63
9	**Кантрольны дыктант**		
10	Дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану, іх утварэнне і ўжыванне	Пазнаёміць вучняў з дзеепрыметнікамі незалежнага і залежнага стану, са спосабамі іх утварэння, напісаннем і ўжываннем дзеепрыметнікаў незалежнага і залежнага стану прошлага часу	§ 8, с. 36 (матэрыял для азнаямлення), практ. 65 (вусна), 66, 67, правіла і матэрыял для азнаямлення (с. 38—39), практ. 69 **Д/з:** § 8, практ. 70
11 12	Правапіс суфіксаў дзеепрыметнікаў	Садзейнічаць фарміраванню ўмення тлумачыць утварэнне дзеепрыметнікаў залежнага стану	§ 9, практ. 72, правіла, практ. 73, 74, 76, 77; практ. 75, 79, 80 (вы-

1	2	3	4
	залежнага стану прошлага часу ***-н-***, ***-ен-***, ***-ан-***, ***-т-***	прошлага часу, правільна ўтвараць і ўжываць іх у сваім маўленні, выпрацоўваць навык правільнага напісання суфіксаў дзеепрыметнікаў ***-н-***, ***-ен-***, ***-ан-***, ***-т-***	пісаць дзеепрыметнікі, абазначыць суфіксы), 81 (вусна) **Д/з**: § 9, практ. 78; 81 (выпісаць дзеепрыметнікі разам з назоўнікамі, запісаць іх адпаведнікі ў беларускай мове, абазначыць суфіксы дзеепрыметнікаў)
13	Поўная і кароткая формы дзеепрыметніка	Дапамагчы вучням асэнсаваць утварэнне і ўжыванне кароткай формы дзеепрыметніка, яе сінтаксічнай ролі ў сказе. Спрыяць фарміраванню ўмення адрозніваць поўныя і кароткія дзеепрыметнікі, правільна ўжываць іх у маўленні	§ 10, практ. 82, правіла, практ. 84, 85, 88 **Д/з**: § 10, практ. 86
14	Асаблівасці ўжывання дзеепрыметнікаў у беларускай мове. Пераклад на беларускую мову тэксту з элементамі апісання знешнасці чалавека	Дапамагчы вучням асэнсаваць, што ў беларускай мове дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану цяперашняга часу ўжываюцца абмежавана; пазнаёміць са сродкамі, якія выкарыстоўваюцца для замены не ўласцівых беларускай мове дзеепрыметнікаў (у тым ліку пры перакладзе); спрыяць выпрацоўцы навыку замяняць не ўласцівыя беларускай мове формы дзеепрыметнікаў цяперашняга часу іншымі моўнымі сродкамі. Фарміраваць уменне перакладаць тэксты: правільна ўспрымаць змест прачытанага на рускай мове і дакладна перадаваць яго па-беларуску; выпрацоўваць уменне карыстацца двухмоўнымі слоўнікамі, правільна перадаваць	§ 11, практ. 89, 90, 94 (вусны пераклад тэксту, запіс сказаў з дзеепрыметнікамі)

1	2	3	4
		пры перакладзе на беларускую мову дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану, рэдагаваць выкананы пераклад	
15 16	Сачыненне-апісанне знешнасці чалавека	Садзейнічаць фарміраванню ў вучняў умення ствараць тэкст-апісанне знешнасці чалавека, выпрацоўваць уменне вызначаць асноўную думку, даваць загаловак, складаць план, адлюстроўваць у ім і раскрываць у змесце тэму і асноўную думку выказвання; захоўваць кампазіцыйную схему апісання, абгрунтоўваць выбар моўных сродкаў, удасканальваць напісанае	§ 13, практ. 103, 104, 105, 106 (з апорай на практ. 41, 42, 69, 77)
II чвэрць (16 урокаў)			
17	Правапіс ***не*** (***ня***) з дзеепрыметнікамі	Пазнаёміць вучняў з правілам напісання ***не*** (***ня***) з дзеепрыметнікамі, фарміраваць навыкі размежавання часціцы і прыстаўкі ***не***, іх правапісу з дзеепрыметнікамі	§ 12, с. 52 (правіла); практ. 95, 96 або 97, 98, 100, 101 **Д/з:** § 12, практ. 102
18	Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага. Марфалагічны разбор	Паглыбіць і сістэматызаваць веды вучняў пра дзеепрыметнік, замацоўваць уменне знаходзіць дзеепрыметнікі і вызначаць іх граматычныя прыметы, правільна ўтвараць і ўжываць дзеепрыметнікі, выдзяляць дзеепрыметнікавыя звароты на пісьме (у неабходных выпадках). Дапамагчы вучням засвоіць парадак марфалагічнага разбору дзеепрыметніка, замацоўваць тэрміналагічныя паняцці па тэме, фарміраваць навыкі	С. 58 (кантрольныя пытанні і заданні), практ. 107, знаёмства з парадкам марфалагічнага разбору дзеепрыметніка, практ. 108

1	2	3	4
		самакантролю, развіваць навуковы стыль маўлення. Выпрацоўваць арфаграфічныя і пунктуацыйныя навыкі вучняў	
Дзеепрыслоўе (9 гадзін, з іх 2 гадзіны — на пісьмовыя работы)			
19	Дзеепрыслоўе як асобая форма дзеяслова: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля	Пазнаёміць вучняў з лексічным і граматычным значэннем дзеепрыслоўя як асобай дзеяслоўнай формы, з яго стылістычнай роляй у тэкстах. Садзейнічаць выпрацоўцы навыку размежавання асноўнага і дадатковага дзеянняў; умець распазнаваць дзеепрыслоўі ў тэкстах, замяняць іх іншымі моўнымі сродкамі (дзеясловамі) і выяўляць сэнсавыя адрозненні; правільна ўжываць дзеепрыслоўі ў маўленні, знаходзіць і выпраўляць памылкі ва ўжыванні дзеепрыслоўяў	§ 14, практ. 110, с. 61 (матэрыял для азнаямлення), с. 62 (правіла), практ. 111, 113, 114, 115 (1—3 сказы) **Д/з**: § 14, практ. 115 (4—7 сказы)
20	Правапіс ***не*** з дзеепрыслоўямі	Выпрацоўваць навык асобнага напісання ***не*** з дзеепрыслоўямі (за выключэннем выпадкаў, калі слова без ***не*** не ўжываецца)	§ 14, практ. 117, правіла, практ. 118, 120, 121 **Д/з**: § 14, практ. 119
21 22	Дзеепрыслоўны зварот, знакі прыпынку	Садзейнічаць асэнсаванню вучнямі дзеепрыслоўнага звароту (дзеепрыслоўе + залежныя словы); паўтарыць будову словазлучэння. Фарміраваць уменне знаходзіць дзеепрыслоўныя звароты ў тэкстах і вызначаць іх сэнсава-стылістычную ролю, выдзяляць інтанацыйна дзеепрыслоўныя звароты ў маўленні. Спрыяць выпрацоўцы навыку выдзялення коскамі дзеепрыслоўяў і дзеепрыслоўных зваротаў, правільнага ўжывання іх у маўленні	§ 15, практ. 122, с. 68 (правіла), практ. 123—125; 127—129, 131 **Д/з**: § 15, практ. 126; 130

Працяг

1	2	3	4
23	Дзеепрыслоўі незакончанага трывання, іх утварэнне і правапіс	Пазнаёміць вучняў са спосабамі ўтварэння дзеепрыслоўяў незакончанага трывання. Садзейнічаць выпрацоўцы ўмення правільна ўтвараць дзеепрыслоўі незакончанага трывання і ўжываць іх у сваім маўленні. Замацоўваць навык у пабудове сказаў з дзеепрыслоўнымі зваротамі	§ 16, практ. 132—134, 137, 138 **Д/з**: § 16, практ. 139
24	Дзеепрыслоўі закончанага трывання, іх утварэнне і правапіс	Пазнаёміць вучняў са спосабамі ўтварэння дзеепрыслоўяў закончанага трывання. Садзейнічаць выпрацоўцы ўмення правільна ўтвараць і ўжываць дзеепрыслоўі закончанага трывання. Замацоўваць навык пабудовы сказаў з дзеепрыслоўнымі зваротамі	§ 17, практ. 140, с. 76 (правіла), практ. 141, 142, 144 **Д/з**: § 17, практ. 143 (спісаць, раскрыўшы дужкі)
25 26	Выбарачны пераказ тэксту на аснове папярэдняй падрыхтоўкі	Выпрацоўваць уменне рабіць выбарачны пераказ тэксту: вызначаць тэму і падтэму ў тэксце, акрэсліваць межы тэмы выбарачнага пераказу, адбіраць неабходны матэрыял, складаць план, звязваць сэнсавыя часткі выбарачнага пераказу паміж сабой, удасканальваць напісанае	Знаёмства з памяткай, практ. 146
27	Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага. Марфалагічны разбор	Паглыбіць і сістэматызаваць веды вучняў па раздзеле, выпрацоўваць уменне рабіць марфалагічны разбор дзеепрыслоўяў. Садзейнічаць замацаванню навыку ўтварэння і ўжывання дзеепрыслоўяў	С. 80 (кантрольныя пытанні і заданні), практ. 147; знаёмства з парадкам марфалагічнага разбору дзеепрыслоўя, практ. 148
Прыслоўе (15 гадзін, з іх 3 гадзіны — на пісьмовыя работы)			
28 29	Прыслоўе як часціна мовы: агульнае зна-	Садзейнічаць фарміраванню ў вучняў паняцця аб прыслоўі як часціне мовы, дапамагчы	§ 19, практ. 150—153; 155—158 **Д/з**: § 19, практ. 154; 159

1	2	3	4
	чэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля	засвоіць асноўную граматычную прымету – нязменнасць, устанавіць агульнае і адметнае паміж прыслоўямі і іншымі часцінамі мовы (прыметнікамі, назоўнікамі, лічэбнікамі); выпрацоўваць уменне фармуляваць азначэнне прыслоўя, распазнаваць у тэксце, вызначаць агульнае граматычнае значэнне, адрозніваць ад іншых часцін мовы, вызначаць сінтаксічную ролю ў словазлучэнні і сказе, сэнсава-стылістычную ролю ў тэксце; ужываць прыслоўі ў вусным і пісьмовым маўленні; выпрацоўваць неабходныя арфаграфічныя навыкі	
30	Разрады прыслоўяў па значэнні (знаёмства)	Спрыяць асэнсаванню вучнямі падзелу прыслоўяў на семантычныя разрады, практычна пазнаёміць са словамі катэгорыі стану, якія з'яўляюцца галоўнымі членамі ў безасабовых сказах, і стылёвымі асаблівасцямі іх ужывання ў тэксце, уключаць прыслоўі ў актыўны слоўнікавы запас вучняў; выпрацоўваць уменні вызначаць семантычную групу прыслоўяў, выдзяляць адпаведныя словазлучэнні, ставіць ад галоўнага слова лагічныя, сэнсавыя пытанні, тлумачыць сэнсава-граматычныя і стылістычныя асаблівасці ўжывання прыслоўяў у тэксце, ужываць ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні	§ 20, практ. 160, 163–167 **Д/з:** § 20, практ. 168 або 169
31 32	Ступені параўнання прыслоўяў. Утварэн-	Пазнаёміць вучняў са спосабамі ўтварэння формаў ступеней параўнання якасных прыслоўяў	§ 21, практ. 170–176; 178–183, 185

1	2	3	4
	не формаў вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання прыслоўяў, асаблівасці іх ужывання ў беларускай мове	і іх сэнсава-стылістычнай ролях у маўленні; выпрацоўваць уменні распазнаваць у тэксце формы ступеней параўнання і вызначаць зыходнае прыслоўе, утвараць формы ступеней параўнання прыслоўяў, падбіраць сінонімы, адрозніваць ад прыметнікаў, пазбягаць выпадкаў аб'яднання састаўных формаў ступеней параўнання; вызначаць сэнсава-стылістычную ролю формаў ступеней параўнання прыслоўяў у тэксце, ужываць ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні	
III чвэрць (22 урокі) **Прыслоўе (працяг, 10 урокаў)**			
33	Пераклад на беларускую мову тэксту мастацкага стылю з элементамі апісання пэўнай мясцовасці	Фарміраваць уменне перакладаць тэксты: правільна ўспрымаць змест прачытанага на рускай мове і дакладна перадаваць яго па-беларуску; удасканальваць уменне карыстацца двухмоўнымі слоўнікамі, правільна перадаваць пры перакладзе прыслоўі; рэдагаваць выкананы пераклад і рабіць яго самаацэнку	Чытанне тэксту для перакладу, гутарка з класам з мэтай выяўлення яго тыпу і стылю, тэмы і асноўнай думкі, адметных мастацкіх сродкаў; вусны калектыўны пераклад тэксту. Самастойны запіс; рэдагаванне ўласнага тэксту з мэтай удасканалення напісанага
34	Утварэнне прыслоўяў	Дапамагчы вучням пазнаёміцца з асноўнымі спосабамі ўтварэння прыслоўяў, устанавіць словаўтваральныя сувязі прыслоўяў з іншымі часцінамі мовы, садзейнічаць абагульненаму ўспрыманню марфалагічнай сістэмы беларускай мовы;	§ 22, практ. 186–190 **Д/з**: § 22, практ. 191

1	2	3	4
		выпрацоўваць уменне выконваць словаўтваральны разбор прыслоўяў, вызначаць выпадкі ўжывання ў ролі прыслоўяў фразеалагізмаў, удасканальваць правапіс прыслоўяў, узбагачаць лексічны і фразеалагічны склад мовы вучняў, вучыць дарэчна ўжываць прыслоўі ў вусным і пісьмовым маўленні; пазнаёміць з парадкам і правіламі поўнага марфалагічнага разбору прыслоўяў	
35	Суфіксальны спосаб утварэння прыслоўяў	Паглыбіць веды вучняў пра суфіксальны спосаб утварэння прыслоўяў, дапамагчы ўсвядоміць, што названым спосабам прыслоўі ўтвараюцца ад назоўнікаў, прыметнікаў, лічэбнікаў, займеннікаў, дзеясловаў, прыслоўяў; пазнаёміць з канкрэтнымі выпадкамі словаўтварэння; выпрацоўваць уменні састаўляць графічную словаўтваральную схему, вылучаць утваральнае слова і словаўтваральны суфікс, характарызаваць [illegible] значэнні адпаведнае прыслоўе; развіваць лінгвістычнае мысленне і навуковы стыль маўлення вучняў, пашыраць іх слоўнікавы склад мовы	§ 23, практ. 193–195 **Д/з**: § 23, практ. 196
36	Прыставачны спосаб утварэння прыслоўяў. Правапіс ***не*** (***ня***), ***ні*** з прыслоўямі	Спрыяць паглыбленню ведаў вучняў аб прыставачным спосабе ўтварэння прыслоўяў, дапамагчы ўсвядоміць, што такім спосабам прыслоўі ўтвараюцца толькі ад прыслоўяў, пазнаёміць з канкрэтнымі выпадкамі прыставачнага ўтварэння прыслоўяў, удасканальваць уменні выконваць	§ 24, 25, практ. 197–200 **Д/з**: § 24, 25, практ. 201

1	2	3	4
		словаўтваральны разбор прыслоўяў, вызначаць утваральнае слова і словаўтваральную прыстаўку, характарызаваць па значэнні вытворнае прыслоўе, ужываць прыслоўі ў вусным і пісьмовым маўленні, дарэчна выкарыстоўваючы іх выяўленчыя і стылістычныя магчымасці. Дапамагчы вучням засвоіць правіла напісання ***не*** (***ня***), ***ні*** з прыслоўямі; выпрацоўваць уменне падбіраць да прыслоўяў у адпаведнасці з кантэкстам сінонімы і антонімы, развіваць памяць вучняў і навуковы стыль маўлення; фарміраваць тонкае адчуванне мовы; працягваць знаёмства з выяўленчымі магчымасцямі прыслоўяў у тэксце, вучыць выкарыстоўваць гэтыя магчымасці ва ўласным маўленні	
37	**Кантрольны падрабязны пераказ тэксту**	Выявіць узровень сфарміраванасці ўменняў вучняў адэкватна перадаваць змест пачутага тэксту, захоўваючы яго структуру, змест, моўныя асаблівасці аўтарскага стылю	Практ. 202
38	Прыставачна-суфіксальны спосаб утварэння прыслоўяў	Садзейнічаць знаёмству вучняў з канкрэтнымі выпадкамі прыставачна-суфіксальнага ўтварэння прыслоўяў, а таксама з утварэннем прыслоўяў шляхам складання слоў і паўтору аднолькавых або блізкіх слоў; навучыць адрозніваць у маўленні прыслоўі, утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам, і аманімічныя назоўнікі, прыметнікі, займеннікі, лічэбнікі з прыназоўнікамі;	§ 26, практ. 203–205, 207–209 **Д/з**: § 26, практ. 206

1	2	3	4
		удасканальваць уменні пазнаваць прыслоўі ў тэксце, вылучаць словазлучэнні з залежнымі прыслоўямі, ставіць ад галоўнага слова пытанне, вызначаць сінтаксічную ролю ў сказе, ужываць прыслоўі ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні	
39	Правапіс прыслоўяў праз дэфіс	Дапамагчы вучням засвоіць правіла напісання дэфіса ў прыслоўях; удасканальваць уменні пазнаваць прыслоўі ў тэкстах, адрозніваць іх ад іншых часцін мовы, вызначаць спосаб утварэння, графічна абазначаць сродкі ўтварэння, дарэчна і правільна ўжываць у вусным і пісьмовым маўленні; фарміраваць у вучняў пачуццё нацыянальнай годнасці	§ 27, практ. 210–213 **Д/з:** § 27, практ. 214
40	Правапіс спалучэнняў слоў, блізкіх да прыслоўяў. Правапіс прыслоўяў разам	Спрыяць асэнсаванню і засваенню вучнямі правілаў напісання блізкіх да прыслоўяў спалучэнняў назоўнікаў з прыназоўнікамі, якія не канчаткова перайшлі ў прыслоўі, а таксама правілаў напісання прыслоўяў разам; развіваць арфаграфічную пільнасць вучняў; выпрацоўваць уменні ўжываць прыслоўі і спалучэнні слоў, блізкіх да прыслоўяў, ва ўласным пісьмовым маўленні	§ 28, 29, практ. 215–221, 223, 224 **Д/з:** § 28, 29, практ. 222
41	Сачыненне-апісанне вёскі (горада, мікрараёна)	Садзейнічаць выпрацоўцы ў вучняў умення выказваць свае думкі на прапанаваную тэму, захоўваючы неабходны тып і стыль маўлення: вучыць	§ 30, практ. 225 **Д/з:** практ. 226

1	2	3	4
		творча асэнсоўваць аб'ём зместу і межы тэмы сачынення, падпарадкоўваць сваю работу асноўнай думцы: назіраць, збіраць і сістэматызаваць назіранні, састаўляць рабочыя матэрыялы, састаўляць план, адбіраць неабходную лексіку, выяўленчыя моўныя сродкі для найбольш выразнага раскрыцця тэмы і асноўнай думкі выказвання; удасканальваць напісанае; выхоўваць цікавасць і любоў да родных мясцін	
42	Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага або тэматычная праверачная работа	Паглыбіць і сістэматызаваць веды вучняў па асноўных пытаннях тэмы, удасканальваць уменні адрозніваць прыслоўі ў тэксце, выяўляць іх сэнсава-граматычную ролю, даваць марфалагічную характарыстыку, выкарыстоўваць сінанімічныя, антанімічныя, стылістычныя і выяўленчыя магчымасці прыслоўяў ва ўласных вусных і пісьмовых выказваннях	Кантрольныя пытанні і заданні на с. 137, практ. 227—231 **Д/з**: практ. 232. Тэматычная праверачная работа на с. 140—141
		Службовыя часціны мовы і выклічнік (1 гадзіна)	
43	Граматычныя асаблівасці службовых часцін мовы і выклічніка	Дапамагчы вучням засвоіць агульную характарыстыку і спецыфіку службовых часцін мовы і выклічніка, ролю ў будове словазлучэнняў і сказаў, іх адрозненне ад самастойных слоў; выпрацоўваць уменне бачыць службовыя часціны мовы і выклічнікі ў тэксце, вызначаць, з якімі самастойнымі часцінамі мовы яны ўжыты; развіваць маналагічнае маўленне вучняў	§ 31, практ. 233—235 **Д/з**: § 31, практ. 236 або 237

1	2	3	4
Прыназоўнік (7 гадзін, з іх 2 гадзіны — на пісьмовыя работы)			
44	Прыназоўнік як службовая часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля	Спрыяць засваенню вучнямі значэння і сінтаксічнай ролі прыназоўніка, які разам са склонавым канчаткам выражае граматычную залежнасць назоўніка, займенніка ці лічэбніка ад іншых слоў у словазлучэнні і абазначае разнастайныя тыпы адносін; практычна пазнаёміць з ужываннем невытворных прыназоўнікаў у структуры дзеяслоўных, іменных і прыслоўных словазлучэнняў; выпрацоўваць уменне выдзяляць са сказаў словазлучэнні, у якіх залежнае слова звязана з галоўным пры дапамозе прыназоўніка (і ў тым выпадку, калі паміж прыназоўнікам і залежным назоўнікам ці займеннікам, лічэбнікам стаіць іншае слова або некалькі слоў); удасканальваць уменне выконваць разбор прыназоўнікавага словазлучэння, ставіць сэнсавае пытанне ад галоўнага да залежнага слова, вызначаць сродкі сувязі, а таксама ўстанаўліваць, у састаў якога члена сказа прыназоўнік уваходзіць	§ 32, практ. 238–240, 242. Навучальны дыктант **Д/з:** § 32, практ. 241
45	Асноўныя значэнні прыназоўнікаў (знаёмства)	Дапамагчы вучням практычна пазнаёміцца з асноўнымі значэннямі, якія выражаюцца ў словазлучэнні пры дапамозе прыназоўнікаў, выпрацоўваць уменне вылучаць прыназоўнікавыя канструкцыі, ставіць пытанне ад галоўнага да залежнага слова і вызначаць, якія значэнні ў іх перадаюцца, пазнаёміць і навучыць карыстацца	§ 33, практ. 243, 244, 246 **Д/з:** § 33, практ. 245

1	2	3	4
		«Тлумачальным слоўнікам беларускіх прыназоўнікаў» П. Шубы; вучыць правільна ўжываць прыназоўнікавыя словазлучэнні ў вусным і пісьмовым маўленні	
46	Невытворныя і вытворныя прыназоўнікі	Садзейнічаць знаёмству вучняў з падзелам прыназоўнікаў паводле паходжання на невытворныя і вытворныя, усведамленню ўтварэння вытворных прыназоўнікаў шляхам пераходу ў разрад службовай часціны мовы некаторых формаў назоўнікаў, а таксама прыслоўяў і дзеепрыслоўяў; пазнаёміць з мнагазначнасцю вытворных прыназоўнікаў; выпрацоўваць умение вызначаць такія прыназоўнікі ў тэксце, адрозніваць ад слоў-амонімаў іншых часцін мовы, ужываць ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні з улікам іх стылёвай афарбоўкі	§ 34, практ. 247. Тлумачальны дыктант **Д/з**: § 34, практ. 248
47	Прыназоўнікі простыя, складаныя і састаўныя, іх ужыванне і правапіс	Дапамагчы вучням пазнаёміцца з будовай прыназоўнікаў; выпрацоўваць умение правільна вылучаць іх са структуры словазлучэння і сказа, удасканальваць арфаграфічныя навыкі вучняў, умение ўжываць прыназоўнікі ў вусным і пісьмовым маўленні, выкарыстоўваючы іх сінанімічныя і аманімічныя магчымасці ў тэкстах розных стыляў	§ 35, практ. 249–253 **Д/з**: § 35, практ. 254
48	Асаблівасці ўжывання некаторых	Дапамагчы вучням практычна авалодаць асаблівасцямі і правіламі ўжывання некаторых пры-	Тэарэтычны матэрыял на с. 160–161, практ. 255–260

1	2	3	4
	прыназоўнікаў у беларускай мове	назоўнікаў у беларускай мове на аснове параўнання з ужываннем тых самых прыназоўнікаў у рускай мове; прадоўжыць фарміраваць уменні вылучаць прыназоўнікавыя словазлучэнні, характарызаваць галоўнае і залежнае словы, фармуляваць сэнсавае і граматычнае пытанні, называць тое значэнне, якое выражаецца пры дапамозе прыназоўніка і формы ўскоснага склону; вызначаць, у састаў якога члена сказа прыназоўнік уваходзіць, заўважаць і выпраўляць памылкі ва ўжыванні прыназоўнікаў у маўленні. Пазнаёміць з парадкам і правіламі марфалагічнага разбору прыназоўніка	**Д/з**: практ. 261 або 262
49	Паглыбленне паняцця пра разважанне як тып маўлення. Напісанне нататкі «Каго можна назваць сапраўдным сябрам?»	Садзейнічаць паглыбленню ведаў вучняў пра разважанне як тып тэксту, нагадаць пра асаблівасці яго будовы, паказаць разнастайныя спосабы абгрунтавання тэзіса (асноўнага палажэння) і іх афармленне ў вусным і пісьмовым маўленні. Пазнаёміць школьнікаў з асаблівасцямі публіцыстычнага жанру нататкі. Фарміраваць уменне вусна і пісьмова пераказваць тэкст тыпу разважання ў публіцыстычным стылі, будаваць уласнае выказванне-разважанне публіцыстычнага характару ў жанры нататкі на даступную падлеткам тэму	§ 36, практ. 263—265 **Д/з**: напісанне нататкі ў школьную газету
50	**Кантрольны дыктант з дадатковымі заданнямі**	Выявіць узровень сфарміраванасці арфаграфічных і пунктуацыйных навыкаў вучняў, аналітыка-сінтэтычных моўных і маўленчых уменняў	

1	2	3	4
		Злучнік (6 гадзін, з іх 1 гадзіна — на пісьмовую работу)	
51	Злучнік як службовая часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля	Дапамагчы вучням асэнсаваць паняцце злучніка як службовай часціны мовы, яго прымет і асноўных функцый; выпрацоўваць уменні фармуляваць азначэнне злучніка, вылучаць злучнікі ў простых і складаных сказах, тэкстах, вызначаць марфалагічныя асаблівасці, характарызаваць іх функцыі, карыстацца злучнікамі ў вусным і пісьмовым маўленні	§ 37, практ. 266—269 **Д/з**: § 37, практ. 270
52	Простыя і састаўныя злучнікі, іх ужыванне. Адзіночныя, парныя, паўторныя злучнікі, іх ужыванне і правапіс	Садзейнічаць знаёмству вучняў са структурай і спосабам ужывання злучнікаў у маўленні; выпрацоўваць уменні вылучаць простыя і састаўныя злучнікі ў тэксце, даваць ім характарыстыку па функцыі, будове і спосабе ўжывання, правільна ўжываць у вусным і пісьмовым маўленні	§ 38, практ. 271—274, 276, 277 **Д/з**: § 38, практ. 275
53	Злучальныя і падпарадкавальныя злучнікі. Злучальныя злучнікі, іх ужыванне	Спрыяць асэнсаванню вучнямі сутнасці падзелу злучнікаў на злучальныя і падпарадкавальныя, іх адрозненця ў значэнні і сінтаксічнаі ролі; прапедэўтычна рыхтаваць школьнікаў да засваення злучнікавых сувязей у складаным сказе; удасканальваць уменні адрозніваць простыя і складаныя сказы, у складаных сказах — злучальную і падпарадкавальную сувязь, вызначаць у сказах злучнікі і іх сінтаксічную ролю. Дапамагчы вучням пазнаёміцца з разрадамі злучальных злучнікаў і асаблівасцямі тых адносін, якія яны	§ 39, 40, практ. 278—281, 283—287 **Д/з**: § 39, 40, практ. 282

1	2	3	4
		перадаюць, паказаць сінтаксічнае раўнапраўе паміж аднароднымі членамі і часткамі складанага сказа, выражанае пры дапамозе злучальных злучнікаў, растлумачыць агульнае значэнне злучнікаў кожнай групы; выпрацоўваць уменні вылучаць злучальныя злучнікі ў сказах і ўстанаўліваць тыя значэнні, што яны перадаюць, складаць сказы з прапанаванымі злучнікавымі канструкцыямі; ужываць разнастайныя злучнікі, у тым ліку з пэўнай выяўленчай функцыяй, ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні	
54	Падпарадкавальныя злучнікі, іх ужыванне	Дапамагчы вучням засвоіць асаблівасці падпарадкавальных злучнікаў, пазнаёміць з іх асноўнымі сэнсавымі групамі; выпрацоўваць уменні выдзяляць галоўную і даданую часткі складаназалежных сказаў, ставіць пытанне ад галоўнай часткі да дадаиай і на гэтай аснове вызначаць групу злучніка; самастойна будаваць складаназалежныя сказы, выкарыстоўваць падпарадкавальныя канструкцыі ва ўласным маўленні	§ 41, практ. 289–295
IV чвэрць (16 урокаў)			
55	Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага	Садзейнічаць падагульненню і сістэматызацыі вывучанага пра злучнік; удасканальваць уменні выяўляць злучнікі ў сказах і тэкстах, вызначаць іх марфалагічныя характарыстыкі, ролю ў маўленні; удасканальваць уменне рабіць вуснае паведамленне на лінгвістычную тэму	Кантрольныя пытанні і заданні на с. 194, практ. 296, 297, 299, 300 **Д/з**: практ. 298

1	2	3	4
56	Кантрольны падрабязны пераказ тэксту мастацкага стылю	Выявіць узровень сфарміраванасці ўменняў вучняў адэкватна перадаваць змест пачутага тэксту мастацкага стылю, захоўваючы яго структуру, змест, вобразна-выяўленчыя сродкі, моўныя асаблівасці аўтарскага стылю	
Часціца (8 гадзін, з іх 2 гадзіны – на пісьмовыя работы)			
57	Часціца як службовая часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля	Пазнаёміць вучняў са службовай часцінай мовы часціцай, дапамагчы асэнсаваць яе ролю ў маўленні: выпрацоўваць уменне фармуляваць азначэнне часціцы, распазнаваць у тэксце, вызначаць яе ролю, адрозніваць ад іншых службовых часцін мовы; выпрацоўваць навык выразнага чытання (правільнае інтанаванне сказаў з часціцамі)	§ 42, практ. 301, с. 199 (матэрыял для азнаямлення, правіла), практ. 302, 303, 305 **Д/з**: § 42, практ. 308
58	Асноўныя значэнні часціц (знаёмства). Формаўтваральныя часціцы	Пазнаёміць вучняў з асноўнымі значэннямі часціц, паказаць багацце адценняў іх значэнняў; садзейнічаць уключэнню часціц у актыўны слоўнікавы запас вучняў. Выпрацоўваць уменне выяўляць значэнні часціц у сказах, тэкстах, надаваць новае значэнне выказванню з дапамогай часціц, вызначаць сэнсава-стылістычныя асаблівасці ўжывання часціц у тэкстах; правільна карыстацца часціцамі для выяўлення сэнсавых і эмацыянальных адносін да выказвання	§ 43, практ. 309–315, 316 (2 сказы), 317 **Д/з**: § 43, практ. 318
59	Правапіс часціц. Марфалагічны разбор	Фарміраваць уменне дэфіснага напісання часціцы *-такі* з дзеясловамі і ў саставе некаторых слоў. Пазнаёміць вучняў з парадкам разбору	§ 44, с. 207 (правіла), практ. 319, 320, с. 208 (знаёмства з парадкам марфалагічнага

Працяг

1	2	3	4
		часціцы; удасканальваць уменне вызначаць значэнне часціцы ў тэксце; выпрацоўваць навык вуснага і пісьмовага разбору часціцы	разбору часціцы), практ. 321 **Д/з**: § 44, практ. 323
60 61	Часціцы ***не***, ***ні***, іх адрозненне	Пазнаёміць з правілам ужывання ***не*** і ***ні***, фарміраваць уменне вызначаць сэнсавае значэнне часціц ***не***, ***ні***; садзейнічаць выпрацоўцы ў вучняў навыкаў адрознення адмоўных сказаў з часціцай ***не*** ад сцвярджальных з часціцай ***ні***; фарміраваць арфаграфічныя навыкі, звязаныя з адрозненнем часціц ***не*** і ***ні***; развіваць уменне карыстацца часціцамі як сродкам сувязі сказаў і частак тэксту; правільна інтанаваць сказы з часціцамі ***не***, ***ні***	§ 45, практ. 324–327, знаёмства са схемай адрознення часціц *не* і *ні* (с. 213); знаёмства са схемай адрознення спалучэнняў *не што іншае, як (не хто іншы, як)* і *нішто іншае не (ніхто іншы не)*, практ. 331, 332, вуснае выказванне пра ўжыванне часціц *не* і *ні* (практ. 333) **Д/з**: § 45, практ. 329; 334
62	Правапіс ***не*** (***ня***), ***ні*** з рознымі часцінамі мовы (паўтарэнне)	Паўтарыць і замацаваць правілы напісання ***не*** з рознымі часцінамі мовы; садзейнічаць фарміраванню ўмення сістэматызаваць і абагульняць раней вывучанае; выпрацоўваць навык напісання ***не***, ***ні*** з рознымі часцінамі мовы	§ 46, с. 216 (чытанне і асэнсаванне табліцы), практ. 335, 337, с. 219 (правіла), практ. 338, 339, 341 **Д/з**: § 46, практ. 342
63 64	Падрабязны, сціслы і выбарачны пераказ аднаго і таго тэксту. Пісьмовы падрабязны (сціслы або выбарачны) пераказ тэксту	Дапамагчы вучням асэнсаваць асаблівасці розных відаў пераказу (падрабязнага, сціслага і выбарачнага) на матэрыяле аднаго і таго тэксту; удасканальваць уменні перадаваць інфармацыю рознымі спосабамі (падрабязна, сцісла, выбарачна), вызначаць тэму (падтэмы) і асноўную думку тэксту, адбіраць матэрыял, неабходны для пэўнага віду пераказу, складаць план, ствараць вуснае і пісьмовае выказванні	§ 46, практ. 343

1	2	3	4
Выклічнік (2 гадзіны, з іх 1 гадзіна — на пісьмовую работу)			
65	Выклічнік як часціна мовы. Дэфіс у выклічніках. Інтанаванне сказаў з выклічнікамі, знакі прыпынку	Садзейнічаць фарміраванню ў вучняў паняцця пра выклічнік як часціну мовы; пазнаёміць з асноўнымі значэннямі, сэнсава-стылістычнай роляй і асаблівасцямі яго ўжывання. Фарміраваць уменне адрозніваць выклічнікі ад самастойных і службовых часцін мовы, а таксама ад гукапераймальных слоў. Садзейнічаць засваенню вучнямі правапісу выклічнікаў; выпрацоўваць уменне пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказах з выклічнікамі, удасканальваць навык інтанавання такіх сказаў, правільнага ўжывання іх у маўленні	§ 47, 48, практ. 344, 345, 349, с. 225 (правіла), практ. 353, 354 **Д/з**: § 47, 48, практ. 355
66	**Кантрольны дыктант з дадатковымі заданнямі**	Выявіць узровень сфарміраванасці арфаграфічных і пунктуацыйных навыкаў вучняў, аналітыка-сінтэтычных моўных і маўленчых уменняў	
Пераход слоў з адной часціны мовы ў іншую (1 гадзіна)			
67	Пераход слоў з адной часціны мовы ў іншую	Пазнаёміць вучняў з такой з'явай, як пераход слоў адной часціны мовы ў іншую; выпрацоўваць уменне вызначаць, у ролі якой часціны мовы выступае тое ці іншае слова; ужываць словы ў ролі розных часцін мовы. Удасканальваць уменне складаць план тэксту і пераказваць змест па плане	Практ. 357, 358 (або 359), 361, 362 **Д/з**: практ. 360

1	2	3	4
Падагульненне вывучанага за год (2 гадзіны)			
68 69	Падагульненне вывучанага за год	Садзейнічаць падагульненню і сістэматызацыі ведаў і ўменняў вучняў па асноўных пытаннях вывучаных раздзелаў і тэм. Узнавіць веды вучняў пра асноўныя прыметы тэксту і іх характарыстыку (азначэнне тэксту; тэматычнае адзінства, звязнасць, паслядоўнасць, разгорнутасць, сэнсавая цэласнасць, завершанасць); пра тыпы і стылі маўлення і іх жанры; пра раздзелы навукі аб мове і іх змест. Спрыяць удасканаленню вымаўленчых, лексічных, граматычных, правапісных, стылістычных навыкаў вучняў; фарміраваць уменне аналізаваць і супастаўляць, сінтэзаваць моўныя факты, рабіць высновы і падагульненні	Тэарэтычны матэрыял на с. 230–231, 234, практ. 363–366, 368, 370–378 **Д/з**: практ. 367
70	Рэзервовая гадзіна		

Беларуская літаратура
7 клас
(53 гадзіны на год)

Размеркаванне вучэбнага матэрыялу прыводзіцца ў адпаведнасці са зместам і структурай вучэбнага дапаможніка: Лазарук, М. А. Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 7-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / М. А. Лазарук, Т. У. Логінава. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2010.

Нумар урока і дата правядзення	Тэма ўрока і асноўныя пытанні	Мэты і задачы ўрока	Матэрыял вучэбнага дапаможніка, дамашняе заданне
1	2	3	4
		ЛІТАРАТУРА – МАСТАЦТВА СЛОВА (5 гадзін)	
1	Уводзіны	Пазнаёміць сямікласнікаў з новым вучэбным дапаможнікам па літаратуры і задачамі, якія яны будуць вырашаць на працягу года; даць уяўленне аб літаратуры як мастацкай з'яве ў сістэме яе сувязей з іншымі відамі мастацтва; развіваць навыкі вуснага маўлення ў працэсе гутаркі па самастойна прачытаных творах; актывізаваць працэс чытання і спрыяць выхаванню цікавасці да прадмета	Уступны артыкул да вучэбнага дапаможніка і артыкул да першага раздзела **Д/з**: у залежнасці ад узроўню падрыхтаванасці класа можна прапанаваць на выбар: а) зрабіць малюнак да эпізода любімага твора і падпісаць радкамі з гэтага ж твора; б) падабраць агульныя па тэме мастацкія творы (напрыклад, пейзажны верш, пейзаж у жывапісе і музычны твор па назіраннях за прыродай);

1	2	3	4
			в) падрыхтаваць паведамленне «Тэма прыроды ў мастакоў, паэтаў, кампазітараў»
2	Якуб Колас. «У яго быў свет цікавы...» (урывак з паэмы «Сымон-музыка»)	Працягваць знаёміць вучняў з творамі пра таленавітых людзей; фарміраваць уменне заўважаць мастацкія дэталі, істотныя для характарыстыкі героя; выпрацоўваць навыкі вызначэння адносін аўтара да героя твора: гонар за яго талент, замілаванае ўспрыманне прыроды, жыцця; развіваць уменне бачыць прыгажосць у звычайным; спрыяць эмацыянальнаму, эстэтычнаму ўспрыманню свету, развіваць пачуццё гармоніі, прыгажосці, дапамагчы вучням асэнсаваць ролю паэта ў грамадстве; абудзіць суперажыванне герою, адоранаму прыродай незвычайным талентам	Тэкст урыўка з паэмы «Новая зямля» і твор М. Багдановіча «Музыка» **Д/з:** навучыцца выразна чытаць урывак, падрыхтаваць адказы на пытанні да яго
3	Янка Купала. «Курган». Уступныя заняткі	Аднавіць і замацаваць звесткі пра жыццё Я. Купалы і пра яго вывучаныя ў папярэдніх класах творы; абудзіць цікавасць да паэмы «Курган»; выявіць першаснае ўспрыманне твора; прааналізаваць першы раздзел паэмы, акцэнтуючы ўвагу на паэтычных вобразах і сродках мастацкай выразнасці, якія дапамагаюць ствараць гэтыя вобразы; развіваць уменне асэнсаванага выразнага чытання; спрыяць выхаванню добразычлівых адносін да людзей, надзеленых яркай індывідуальнасцю	Тэкст паэмы «Курган» **Д/з:** адказаць на пытанні да паэмы (1—4), падрыхтавацца да выразнага чытання першага раздзела паэмы і, па жаданні, зрабіць ілюстрацыі да гэтага раздзела

1	2	3	4
4	Янка Купала. «Курган». Вобразы гусляра і князя	Працягваць знаёміць вучняў з паэмай Я. Купалы; актуалізаваць звесткі аб прыёмах стварэння мастацкага вобраза: партрэт, учынкі, адносіны да іншых персанажаў, аўтарская ацэнка героя; выпрацоўваць уменне даваць ацэнку паводзінам героя зыходзячы з яго учынкаў; шляхам кантраснага супастаўлення раскрыць вобразы князя як прадстаўніка прыгняталынікаў і гусляра — народнага песняра, які выражае думкі народа; акцэнтаваць увагу на паводзінах герояў у крытычнай сітуацыі; дапамагчы пераканацца ў маральнай перамозе гусляра над князем; спрыяць фарміраванню жыццёвага ідэалу	Тэкст паэмы «Курган» **Д/з**: вывучыць урывак (на выбар вучняў) на памяць
5	Янка Купала. «Курган». Мастацкія асаблівасці паэтычнага твора	Паглыбіць веды вучняў пра адметнасці будовы паэтычнага твора, выпрацоўваць уменне чытаць і аналізаваць яго; выдзяляць эпізоды, якія дапамагаюць зразумець кампазіцыю твора, вызначаць асноўныя прыметы жанру паэмы: рамантычны характар сюжэта, глыбокія перажыванні аўтара і герояў; паказаць сувязь паэмы з фальклорам; фарміраваць у вучняў цікавасць да вуснай народнай творчасці, развіваць іх мастацка-эстэтычную ўспрымальнасць і эмацыянальнасць	Тэкст паэмы «Курган» **Д/з**: адказаць на пытанні да паэмы (5—9), падрыхтаваць адказ на пытанне «На якой падставе аўтары вучэбнага дапаможніка аб'ядналі вывучаныя вамі творы ў раздзел пад назвай "Чарадзейная сіла мастацтва"?»
6	Урок развіцця маўлення. Схема пабудовы выказвання-разважання.	Выпрацоўваць навыкі даваць аргументаваныя адказы на праблемныя пытанні; развіваць вуснае маўленне сямікласнікаў пры падрыхтоўцы выказванняў на літаратурныя тэмы, прапанаваныя	Настаўнік прапаноўвае прыкладныя тэмы для вусных выказванняў

1	2	3	4
	1. Тэзіс. 2. Аргументы (доказы, матывы, абгрунтаванні), прыклады. 3. Вывад або заключэнне. (Падрыхтоўка да звязнага выказвання зводзіцца да перадачы ў сістэматызаваным выглядзе аргументаў і прыкладаў, якімі будзе карыстацца вучань.)	аўтарамі вучэбнага дапаможніка для падагульнення па раздзеле; спрыяць фарміраванню пачуцця грамадзянскага абавязку і адказнасці	**Д/з**: падрыхтаваць вуснае выказванне на адну з тэм: 1. Каб крануць нас да слёз, сам зарыдай, паэт.' 2. Калі музыка плача, то разам з ім плача ўсё чалавецтва, уся прырода. 3. І такі быў той музыка-чарадзей, што захоча, тое з сэрцам зробіць
ВЕРШАВАНЫЯ І ПРАЗАІЧНЫЯ МАСТАЦКІЯ ТВОРЫ (4 гадзіны)			
7	Якуб Колас. «Ручэй»	Пазнаёміць з уступным артыкулам да раздзела «У вершах і ў прозе»; выпрацоўваць уменне заўважаць дэталі і перадаваць іх, выкарыстоўваючы прыём вуснага малявання; пашыраць слоўнікавы запас мовы вучняў; параўнаць паказ аднолькавай з'явы прыроды ў паэтычным творы Я. Коласа «Ручэй» і празаічным творы Т. Хадкевіча «Крынічка», звярнуць увагу на тое, як адрозніваюцца па знешніх адзнаках, па мове, па спосабах, прыёмах і сродках створаныя вобразы ў розных відах літаратурнай мастацкай творчасці;	Уступны артыкул, верш Я. Коласа «Ручэй» і празаічны твор Т. Хадкевіча «Крынічка» **Д/з**: вывучыць верш «Ручэй» на памяць

1	2	3	4
		развіваць здольнасць адклікацца на аўтарскае паэтычнае бачанне свету	
8	Васіль Быкаў. «Незагойная рана»	Узнавіць веды пра В. Быкава, увесці вучняў у свет прозы пісьменніка, прыгадаўшы прачытаныя раней творы аб вайне; пазнаёміць са зместам апавядання «Незагойная рана»; высветліць пераноснае значэнне назвы твора; вызначыць, чым адрозніваецца гэты твор ад папярэдніх на аналагічную тэму; развіваць эмацыянальную чуйнасць, здольнасць суперажываць героям; выхоўваць негатыўнае стаўленне да вайны	Тэкст апавядання В. Быкава «Незагойная рана» і верш В. Зуёнка «З вайны сустрэлі мацяркі сыноў...» **Д/з**: падрыхтаваць пераказ твора, выкарыстаўшы план апавядання, прапанаваны ў вучэбным дапаможніку
9	Васіль Быкаў. «Незагойная рана». Вобраз галоўнай гераіні твора	Раскрыць душэўны стан маці, якая чакае з вайны сына; выпрацоўваць уменне вызначаць ролю бытавых дэталяў, успамінаў, эпізадычных вобразаў апавядання (пісьманосца, суседкі Ульянкі, хлопца на малатарні) у раскрыцці душэўнага стану маці, якая чакае з вайны сына, драматызму становішча старой Тэклі; спыніцца на мастацкіх прыёмах, якія дапамагаюць аўтару раскрыць пачуцці маці; акцэнтаваць увагу на майстэрстве аўтара ў паказе жыцця гераіні на працягу адных сутак; выхоўваць павагу да ветэранаў вайны і працы, сваіх бацькоў, старэйшых людзей	Тэкст апавядання В. Быкава «Незагойная рана» **Д/з**: прадоўжыць апавяданне, развіваючы сюжэт і прытрымліваючыся агульнага настрою твора
10	Васіль Быкаў. «Незагойная рана». Майстэрства	Пазнаёміць з артыкулам «Пейзаж», вызначыць ролю пейзажу ў раскрыцці настрояў, перажыванняў гераіні; паказаць, як праз апісанні пры-	Тэкст апавядання В. Быкава «Незагойная рана» і тэкст артыкула «Пейзаж»

1	2	3	4
	пісьменніка ў раскрыцці характараў	роды выяўляюцца пачуцці аўтара, яго адносіны да жыцця; раскрыць псіхалагічнае майстэрства В. Быкава ў паказе абставін і характараў герояў твора; спрыяць станаўленню ў вучняў антываеннага настрою і ўдзячнасці за шчасце жыць у мірны час	**Д/з**: падрыхтаваць адказы на пытанні да другога раздзела. Скласці зборнік найбольш цікавых (на думку вучняў) твораў беларускіх пісьменнікаў на ваенную тэму (на выбар)
11	Урок развіцця маўлення. Схема будовы апавядальнага тэксту. 1. Уступ. 2. Паведамленне пра месца і час, калі адбывалася падзея. 3. Знаёмства з дзейнай асобай (альбо некалькімі). 4. Непасрэдныя дзеянні, іх асаблівасці і парадак. 5. Указанне на завяршэнне дзеяння. 6. Вывад (раскрыць павучальны сэнс гэтай гісторыі)	Выпрацоўваць навыкі маналагічнага маўлення пры падрыхтоўцы вуснага апавядання на падставе ўласных назіранняў за падзеямі, якія адбываліся з вамі, вашымі блізкімі і знаёмымі, пры вашай непасрэднай прысутнасці; раскрыць павучальны сэнс гэтай гісторыі; развіваць назіральнасць, увагу, аналітыка-сінтэтычнае мысленне вучняў	**Д/з**: скласці план, па ім падрыхтаваць сваю гісторыю і прыняць удзел у конкурсе на лепшага апавядальніка
ПАЭЗІЯ. РАЗНАСТАЙНАСЦЬ ІДЭЙНА-ЭСТЭТЫЧНАГА ПАФАСУ ПАЭТЫЧНЫХ ТВОРАЎ (9 гадзін)			
12	Віктар Шніп. «Паэзія» або	Пазнаёміць з уступным артыкулам да раздзела; дапамагчы вучням зразумець мнагазначнасць	Тэксты вершаваных твораў

1	2	3	4
	Леанід Галубовіч. «Паэзія»	паняцця «паэзія»; пашырыць веды пра разнастайнасць тэматыкі паэтычных твораў; асэнсаваць сродкі мастацкай выразнасці ў вершы, паглыбіць веды аб выхаваўчай ролі паэтычных твораў; развіваць творчыя здольнасці і слоўнікавы запас мовы пры абмеркаванні твораў; працягваць фарміраваць чытацкія якасці вучняў, неабходныя для паўнавартаснага ўспрымання лірыкі: эмацыянальную чуласць, вобразнае, асацыятыўнае мысленне, эстэтычную рэакцыю на мастацкае слова	Д/з: падрыхтаваць выразнае чытанне верша і адказ на пытанне пра ролю паэзіі ў жыцці чалавека
13	Максім Багдановіч. «Маёвая песня» («Па-над белым пухам вішняў...»)	Выпрацоўваць навыкі аналізу пейзажных твораў, пашырыць уяўленні вучняў аб паэзіі за кошт увядзення ў іх чытацкую свядомасць верша «Маёвая песня», вызначыць ролю вобразна-выяўленчых сродкаў у вершы, развіваць навыкі выразнага чытання; выхоўваць мастацкі густ і творчую самастойнасць падлеткаў	Тэксты верша М. Багдановіча «Маёвая песня» і артыкула «Пра вершаскладанне» Д/з: падрыхтаваць адказы на пытанні да артыкула «Пра вершаскладанне»; вывучыць верш М. Багдановіча «Маёвая песня» на памяць
14	Пазакласнае чытанне. Раіса Баравікова. «Казкі астранаўта»	Пазнаёміць вучняў з тымі дзівоснымі, неверагоднымі прыгодамі, часам небяспечнымі і нават экстрэмальнымі, якія адбываюцца з беларусамі-астранаўтамі. Звярнуць увагу на міралюбівы характар сустрэч беларусаў з жыхарамі іншых планет, на магчымасць бесканфліктнага існавання людской супольнасці: ні на зямлі, ні ў космасе не павінна быць варожасці, зайздрасці, злосці,	Тэкст твора Р. Баравіковай «Казка астранаўта»

1	2	3	4
		усе непаразуменні паміж людзьмі можна вырашыць мірным шляхам. Выхоўваць гуманнасць і дабрыню, вернасць сяброўству	
15	Данута Бічэль. «Роднае слова»	Працягваць знаёміць вучняў з разнастайнасцю тэматыкі паэтычных твораў і іх мастацкімі асаблівасцямі; абудзіць захапленне прыгажосцю роднай зямлі; данесці да вучняў высокі пафас і задушэўнасць літаратурнага твора; развіваць уменне вызначаць у мастацкім тэксце паэтычныя звароты, эпітэты, паўторы, разумець іх функцыянальную ролю ў перадачы думкі-перажывання; выхоўваць актыўную грамадзянскую пазіцыю, патрыятычныя адносіны да сваёй краіны, пашану да мовы	Тэкст верша Д. Бічэль «Роднае слова» **Д/з**: верш Д. Бічэль «Роднае слова» вывучыць на памяць
16	Рыгор Барадулін. «Мы – беларусы»	Пашыраць веды вучняў пра вершы патрыятычнай тэматыкі ў творчасці беларускіх пісьменнікаў; вучыць за словам і вобразамі бачыць жыццёвы змест; узбагачаць уяўленні падлеткаў пра вобразныя, мастацкія асаблівасці вершаў; развіваць самастойнасць і творчасць у падрыхтоўцы да ўрокаў літаратуры; спрыяць асэнсаванню сутнасці і ролі грамадзяніна сваёй краіны	Тэкст верша Р. Барадуліна «Мы – беларусы» **Д/з**: вывучыць верш Р. Барадуліна «Мы – беларусы» на памяць
17	Анатоль Вярцінскі. «Рэквіем па кожным чацвёртым». Трагічны пафас твора	Эмацыянальна падрыхтаваць вучняў да ўспрымання твора «Рэквіем па кожным чацвёртым», дапамагчы асэнсаваць яго трагічны пафас; акцэнтаваць увагу на асаблівасцях зместу і формы,	Тэкст вершаванага твора А. Вярцінскага «Рэквіем па кожным чацвёртым»

1	2	3	4
		якія характэрны для рэквіема; фарміраваць пачуццё любові да Радзімы і непрыняцця вайны	**Д/з**: падрыхтаваць адказы на пытанні да твора
18	«Рэквіем па кожным чацвёртым» — напамін і запавет жывым	Выпрацоўваць навыкі вызначаць у кожнай частцы твора мастацкія прыёмы, якія ўзмацняюць вастрыню ўспрымання і іх ролю ў раскрыцці ідэі твора (выкарыстаць музычныя творы Г. Вагнера «Вечна жывыя» ці Д. Кабалеўскага «Рэквіем»); развіваць уменне выразна чытаць паэтычны тэкст; выхоўваць пачуццё еднасці са сваім народам і гатоўнасць стаць на абарону сваёй Радзімы	Тэкст вершаванага твора А. Вярцінскага «Рэквіем па кожным чацвёртым» **Д/з**: падрыхтаваць выразнае чытанне твора
19	Ніл Гілевіч. «Маці» або Васіль Зуёнак. «Я са шляхоў далёкіх...»	Паглыбляць веды пра жанравыя асаблівасці лірычнай споведзі (даверлівасць інтанацый, глыбокі лірызм, задушэўнасць); данесці да вучняў шчырасць і ўсхваляванасць сына ад сустрэчы з самым дарагім чалавекам у вершы Н. Гілевіча «Маці». Данесці сыноўнюю любоў і шчымлівую радасць ад сустрэчы з маці, перададзеныя ў вершы В. Зуёнка «Я са шляхоў далёкіх...»; звярнуць увагу вучняў на тое, што гэтыя пачуцці не выказваюцца адкрыта, непасрэдна, а быццам стоены за іншымі словамі, угадваюцца па інтанацыі, намёку; засяродзіць увагу на будове верша, параўнаць з папярэднім на тую самую тэму; пазнаёміць з артыкулам «Падтэкст у паэтычным творы»; выхоўваць любоў і павагу да маці	Тэкст вершаваных твораў Н. Гілевіча «Маці» або В. Зуёнка «Я са шляхоў далёкіх...» **Д/з**: падрыхтаваць вуснае паведамленне на тэму «Самы дарагі мой чалавек...»

Працяг

1	2	3	4
20	Якуб Колас. «Дзядзька-кухар» (урывак з паэмы «Новая зямля»). Вобраз дзядзькі Антося	Узбагаціць чытацкія веды сямікласнікаў пра паэзію Я. Коласа, пашырыць іх уяўленні пра народныя вытокі яго творчасці; раскрыць майстэрства паэта ў абмалёўцы вобраза галоўнага героя; звярнуць увагу на спосабы і сродкі, якімі ствараецца камічнае ў творы; удасканальваць маўленчую культуру вучняў; развіваць эстэтычны густ; выхоўваць пачуццё гуманнасці і дабрыні	Тэкст урыўка Я. Коласа «Дзядзька-кухар» (з паэмы «Новая зямля») **Д/з**: падрыхтаваць аповед пра дзядзьку Антося, выкарыстаўшы прыём вуснага малявання
21	Якуб Колас. «Дзядзька-кухар» (урывак з паэмы «Новая зямля»). Выразнае чытанне паэтычных твораў	Скласці план урыўка (для загалоўка кожнай часткі выкарыстаць радкі з паэмы); пазнаёміць з артыкулам «Выразнае чытанне»; вызначыць спосабы раскрыцця зместу ў творы; выпрацоўваць навыкі выразна чытаць паэтычны тэкст, карыстаючыся адпаведнай інтанацыяй, мімікай, жэстамі; спрыяць узнікненню эмацыянальных адносін да падзей і герояў; развіваць творчыя здольнасці падлеткаў	Тэкст урыўка «Дзядзька-кухар» (з паэмы Я. Коласа «Новая зямля») **Д/з**: падрыхтаваць выразнае чытанне ўрыўка «Дзядзька-кухар» і адказы на пытанні і заданні да раздзела
22	Урок развіцця маўлення. Замацаванне ведаў па тэме «Паэзія»	Дапамагчы вучням асэнсаваць раздзел у цэлым па пытаннях і заданнях вучэбнага дапаможніка; акцэнтаваць увагу вучняў на разнастайнасць тэм і вобразаў вершаваных твораў; выпрацоўваць уменне даваць разгорнутыя адказы на пытанні, выкарыстоўваючы дадатковы матэрыял; пашыраць слоўнікавы запас вучняў; выхоўваць цікавасць да творчасці сучасных паэтаў	Выкарыстаць пытанні да раздзела **Д/з**: падрыхтаваць вуснае выказванне на тэму «Роля паэзіі ў маім жыцці». Прачытаць апавяданне З. Бядулі «На Каляды к сыну»

1	2	3	4
АДЛЮСТРАВАННЕ ЖЫЦЦЯ Ў ПРАЗАІЧНЫХ ТВОРАХ (15 гадзін)			
23	Змітрок Бядуля. «На Каляды к сыну». Трагедыя Тэклі	Пазнаёміць з уступным артыкулам «Цікавае і захапляючае ў звычайным і паўсядзённым». Высветліць першыя чытацкія ўражанні ад апавядання «На Каляды к сыну», паказаць душэўную драму маці Лаўрука; звярнуць увагу сямікласнікаў на тое, якім чынам аўтар вырашае галоўную праблему твора (пейзаж, сродкі мастацкай выразнасці, мастацкая дэталь); развіваць пазнавальную актыўнасць вучняў; выхоўваць пачуццё суперажывання гераіні твора	Тэкст празаічнага твора З. Бядулі «На Каляды к сыну» і артыкула «Мастацкая дэталь» **Д/з**: падрыхтаваць адказы на пытанні да твора
24	Змітрок Бядуля. «На Каляды к сыну». Вобраз Лаўрука	Паглыбляць уменні характарызаваць героя па яго паводзінах і ўчынках, вызначыць ролю мастацкай дэталі ў паступовым паказе змен у характары Лаўрука; фарміраваць уменне даваць маральную ацэнку негатыўным паводзінам героя	Тэкст празаічнага твора З. Бядулі «На Каляды к сыну» **Д/з**: падрыхтаваць вуснае паведамленне на тэму «Чым, на вашу думку, выкліканы такія паводзіны Лаўрука?»
25	Урок развіцця маўлення	Фарміраваць уменне рабіць інсцэніроўку па ўрыўку з эпічнага твора (вызначаць дзейных асоб і выканаўцаў, прадумваць мізансцэны, складаць тэксты рэмарак і рэплік); развіваць творчыя здольнасці вучняў; выхоўваць мастацка-эстэтычны густ	**Д/з**: прыдумаць касцюмы для выканаўцаў інсцэніроўкі
26	Змітрок Бядуля. «На Каляды к сыну».	Выпрацоўваць уменне даваць узаемаацэнку пры праслухоўванні вусных паведамленняў. Выявіць	Тэкст празаічнага твора З. Бядулі «На Каляды к сыну»

1	2	3	4
	Праблема маральнага выбару	пазіцыю аўтара ў адносінах да героя; фарміраваць аналітыка-сінтэтычныя ўменні вучняў і іх жыццёвыя ідэалы	**Д/з**: падрыхтаваць вуснае сачыненне-разважанне «Як, на вашу думку, складзецца далейшае жыццё героя?»
27	Урок пазакласнага чытання. Васіль Быкаў. «Альпійская балада»	Увесці вучняў у свет быкаўскай прозы, калі ваеннае мінулае ажывае максімальна праўдзіва. Паказаць трагічны лёс нашых ваеннапалонных, іх самаахвярны гераізм. Асобна спыніцца на гісторыі кахання беларуса Івана Цярэшкі і дзяўчыны з Італіі Джуліі. Выхоўваць пачуццё патрыятызму	Тэкст твора В. Быкава «Альпійская балада» **Д/з**: прачытаць твор Я. Брыля «Сірочы хлеб»
28	Уступныя заняткі. Аўтабіяграфізм аповесці Янкі Брыля «Сірочы хлеб»	Зацікавіць вучняў асобай пісьменніка; пазнаёміць з гісторыяй напісання аповесці «Сірочы хлеб»; адзначыць падабенства лёсаў Даніка Мальца і Янкі Брыля; выявіць першыя чытацкія ўражанні; развіваць вуснае маўленне, чытацкую зацікаўленасць; выхоўваць пачуццё спагадлівасці да малодшых	Тэкст твора Я. Брыля «Сірочы хлеб» **Д/з**: вылучыць эпізоды, у якіх дзейнічае галоўны герой аповесці, і падрыхтавацца да выбарачнага пераказу
29	Вобраз Даніка Мальца	Акцэнтаваць увагу вучняў на лёсе кемлівага і дапытлівага хлопчыка; дапамагчы асэнсаваць матывы яго паводзін, убачыць галоўнага героя як разумнага і разважлівага хлопчыка; удасканальваць уменне рабіць выбарачны пераказ і знаходзіць галоўнае ў тэксце мастацкага твора; спрыяць фарміраванню непрыняцця прыніжэння і выхоўваць пачуццё ўласнай годнасці	Тэкст твора Я. Брыля «Сірочы хлеб» **Д/з**: выбраць яркія эпізоды, звязаныя з Міколам Кужалевічам, падрыхтаваць цытатную характарыстыку

1	2	3	4
30	Настаўнікі Даніка. Вобраз пані Мар'і	Паказаць вучням, які ўплыў на Даніка Мальца мелі сапраўдныя настаўнікі: Мікола Кужалевіч, пані Мар'я, як яны зацікавілі хлопчыка праблемай самавыхавання; выпрацоўваць уменне характарызаваць герояў, выкарыстоўваючы цытаты з тэксту; выхоўваць павагу да дарослых і настаўнікаў	Тэкст твора Я. Брыля «Сірочы хлеб» **Д/з**: падрыхтаваць дыялог і рэмаркі для сцэнарыя «Развітанне пані Мар'і са сваімі вучнямі»
31	Урок-інсцэніроўка «Развітанне пані Мар'і са сваімі вучнямі»	Паглыбіць уяўленне пра вобраз пані Мар'і і яе ўплыў на падлеткаў; развіваць творчыя здольнасці вучняў у час чытання па асобах і інсцэніроўцы ўрыўкаў з твора; выпрацоўваць уменне фармуляваць і выказваць свае думкі; выхоўваць маральна-этычныя якасці падлеткаў	Тэкст твора Я. Брыля «Сірочы хлеб» **Д/з**: падрыхтаваць адказы на пытанні: «Як бы вы сфармулявалі галоўную думку, ідэю твора?», «Чаму пісьменнік даў яму назву "Сірочы хлеб"?»
32	Мастацкія асаблівасці аповесці Янкі Брыля «Сірочы хлеб»	Пазнаёміць вучняў са спосабамі і прыёмамі, якія выкарыстоўвае аўтар аповесці для раскрыцця тэмы і ідэі твора, характарыстыкі персанажаў; вучыць падлеткаў складаць меркаванне-выказванне аб тым, чаму лёс («хлеб») Даніка Мальца названы сірочым; развіваць вуснае маўленне вучняў; выхоўваць цікавасць да творчасці Я. Брыля	Тэкст твора Я. Брыля «Сірочы хлеб» **Д/з**: скласці план артыкула «Аповед, апісанне, дыялог». Прачытаць твор І. Навуменкі «Жуль Верн»
33	Іван Навуменка. «Жуль Верн». Таямнічае вабіць	Дапамагчы вучням зразумець галоўны пафас твора – рамантыку пазнання жыцця і свету; выклікаць цікавасць да падарожжаў і незвычайных прыгод; адзначыць ролю кнігі ў лёсе героя-	Тэкст празаічнага твора І. Навуменкі «Жуль Верн» **Д/з**: падрыхтаваць пераказ тэксту

1	2	3	4
		апавядальніка; выхоўваць пачуцці высакароднасці і жыццёвай мэтанакіраванасці	
34	Іван Навуменка. «Жуль Верн». Характарыстыка вобразаў падлеткаў	Удасканальваць уменне складаць план твора і па ім характарызаваць змест і вобразы: вызначыць ролю таямнічага і незвычайнага ў далейшым выбары жыццёвага шляху герояў-падлеткаў; выхоўваць такія маральныя якасці, як шчырасць, спагадлівасць, мужнасць, дабрыня	Тэкст празаічнага твора І. Навуменкі «Жуль Верн» **Д/з**: прачытаць апавяданне І. Навуменкі «Настаўнік чарчэння»
35	Іван Навуменка. «Жуль Верн». Вобразы Антона Антонавіча і пісьменніка-фантаста Жуль Верна	Пашыраць уяўленні вучняў пра тое, як раскрываюцца вобразы герояў у празаічным творы, падключыць самастойна прачытанае апавяданне «Настаўнік чарчэння»; выхоўваць павагу да людзей, якія самаадданa працуюць на карысць сваёй Радзімы	Тэкст празаічных твораў І. Навуменкі «Жуль Верн» і «Настаўнік чарчэння» **Д/з**: падрыхтаваць вуснае паведамленне на тэму «Самымі галоўнымі якасцямі асобы я лічу...»
36	Янка Маўр. «Палескія рабінзоны» (выбраныя раздзелы)	Працягваць знаёміць вучняў з жанравымі асаблівасцямі прыгодніцкіх твораў; зацікавіць іх аповесцю і прыгодамі галоўных герояў. Паказаць кантраст паміж марай герояў і рэальнай небяспекай; раскрыць вобразы галоўнах герояў Мірона і Віктара; выхоўваць цікавасць да пазнання таямніц свету	Тэкст твора Я. Маўра «Палескія рабінзоны» **Д/з**: прачытаць твор М. Лупсякова «Мэры Кэт»
37	Мікола Лупсякоў. «Мэры Кэт»	Выпрацоўваць навыкі знаходзіць у тэксце розныя прыёмы мастацкага адлюстравання жыцця (аповед, апісанне, дыялог); дапамагчы вучням адчуць настрой эмацыянальнай прыўзнятасці ад	Тэкст празаічнага твора М. Лупсякова «Мэры Кэт» **Д/з**: падрыхтаваць пераказ твора

1	2	3	4
		пачуцця першага кахання, якое застаецца ў апавяданні як бы прыхаваным за паўсядзённымі падзеямі школьнага і вясковага жыцця; выхоўваць культуру інтымных адносін	
38	Мікола Лупсякоў. «Мэры Кэт». Вобраз Эмы	Удасканальваць набытыя раней уменні работы з празаічным творам (аднаўленне яго падзейнага боку), асэнсаванні неаддзельнасці назвы ад тэксту, здольнасці паглыбляцца ў падтэкст, які дапамагае чытачам далучыцца да самых патаемных перажыванняў і думак героя; раскрыць вобраз Эмы; звярнуць увагу на партрэт і яго функцыянальную ролю; дапамагчы зразумець аўтарскія адносіны да гераіні, якія перадаюцца праз усрыманне Антона; выхоўваць культуру маўленчых узаемаадносін	Тэкст празаічнага твора М. Лупсякова «Мэры Кэт» **Д/з**: знайсці ў тэксце апісанні, лірычныя адступленні і вызначыць іх ролю ў тэксце
39	Мікола Лупсякоў. «Мэры Кэт». Вобраз галоўнага героя твора	Раскрыць вобраз галоўнага героя твора; прасачыць за зменамі ў паводзінах і перажываннях Антона, якія адбываліся пасля знаёмства з Эмай; дапамагчы вучням адчуць лірызм твора, прыгажосць і выразнасць мовы, мяккі гумар; выхоўваць культуру ўзаемаадносін паміж падлеткамі. (Пры рабоце на ўроку падключыць твор А. Васілевіч «Горкі ліпавы мёд».)	Тэксты празаічных твораў М. Лупсякова «Мэры Кэт» і А. Васілевіч «Горкі ліпавы мёд» **Д/з**: падрыхтаваць адказы на пытанні да твора М. Лупсякова «Мэры Кэт»
40	Урок пазакласнага чытання (можна правесці па адным з твораў, змешчаных	Сарыентаваць вучняў на чытанне твораў з хрэстаматыі, зацікавіць іх тэматыкай і зместам; прааналізаваць адно з апавяданняў (на выбар настаўніка)	Тэкст твора з хрэстаматыі для пазакласнага чытання

1	2	3	4
	у хрэстаматыі для пазакласнага чытання для вучняў 7 класа «Вытокі»)		**Д/з**: падрыхтавацца да тэматычнага кантролю па пытаннях да раздзела
ПАЭЗІЯ Ў ПРОЗЕ І ПРОЗА Ў ПАЭЗІІ (3 гадзіны)			
41	Паэзія ў прозе і проза ў паэзіі	Выявіць узровень засваення ведаў пра прозу як від мастацкай творчасці па пытаннях да раздзела «Адлюстраванне жыцця ў празаічных творах». Пазнаёміць вучняў з уступным артыкулам да раздзела «Паэзія ў прозе і проза ў паэзіі» і давесці яго галоўную думку: паэзія і проза ў мастацкай літаратуры заўсёды ідуць побач, цесна звязаны і ўзаемадзейнічаюць; развіваць уменне знаходзіць у празаічных творах адзнакі вершаваных; выхоўваць аналітыка-сінтэтычнае мысленне вучняў	Тэкст уступнага артыкула **Д/з**: знайсці ў вядомых празаічных творах радкі, празаічныя па форме, але з адзнакамі вершаванага твора
42	Якуб Колас. «Думкі ў дарозе» або Змітрок Бядуля. «Шчасце не ў золаце»	Удасканальваць уменне выразнага чытання (узор лірычнай прозы Я. Коласа «Думкі ў дарозе» або З. Бядулі «Шчасце не ў золаце» — на выбар), выявіць першаснае ўспрыманне твора і акцэнтаваць увагу вучняў на яго адрозненні ад іншых празаічных твораў; выхоўваць патрыятычныя і грамадзянскія пачуцці	Тэксты празаічных твораў Я. Коласа «Думкі ў дарозе» або З. Бядулі «Шчасце не ў золаце» **Д/з**: падрыхтаваць выразнае чытанне твора і адказы на пытанні да яго
43	Максім Танк. «Дрэвы паміраюць»	Пазнаёміць вучняў з разнавіднасцю паэтычных твораў у форме свабодна арганізаванай мовы;	Тэксты твораў М. Танка «Дрэвы паміраюць», А. Разанава

1	2	3	4
		дапамагчы ўсвядоміць схільнасць свабоднага верша да філасофскага абагульнення і глыбіні думкі; звярнуць увагу на сціласць і выразнасць мовы, падзел тэксту на радкі, як у вершы, але без строгага рытму і рыфмы; спрыяць фарміраванню ўдумлівых адносін да жыцця, спагадлівасці да равеснікаў і дарослых	«У парку», Я. Сіпакова «Спяць у снарадах...» **Д/з:** падрыхтавацца да тэматычнага кантролю па пытаннях да раздзела
МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА І НАВУКА (9 гадзін)			
44	Мастацкая літаратура і навука. Цётка. «Шануйце роднае слова»	Увесці вучняў у спецыфіку раздзела «Мастацкая літаратура і навука»; выявіць першаснае ўспрыманне артыкула «Шануйце роднае слова» і вызначыць галоўную праблему, узнятую аўтарам; дапамагчы вучням адчуць клопат Цёткі пра лёс роднай мовы; выклікаць жаданне зберагаць яе і карыстацца беларускай мовай у паўсядзённым жыцці	Тэкст артыкула Цёткі «Шануйце роднае слова» **Д/з:** падрыхтаваць адказы на пытанні да артыкула «Мастацкая літаратура і навука»
45	Артыкул Цёткі «Шануйце роднае слова» — узор публіцыстычнага твора	Выпрацоўваць навыкі складання тэзісаў на матэрыяле артыкула «Шануйце роднае слова»; паглыбіць паняцце пра тып маўлення — разважанне; акцэнтаваць увагу на падабенстве і адрозненні публіцыстычных твораў ад твораў мастацкай літаратуры адносна паказу жыцця (звярнуць увагу на лагічныя довады і эмацыянальныя звароты, заклікі да актыўнай дзейнасці ў падтрымку культуры ў публіцыстычных творах); выхоўваць патрыятычныя пачуцці	Тэкст артыкула Цёткі «Шануйце роднае слова» **Д/з:** пазнаёміцца з урыўкам з нарыса У. Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі» («Вёска, о родная вёска мая!»)

1	2	3	4
46	Уладзімір Караткевіч. «Зямля пад белымі крыламі»	Працягваць знаёміць вучняў з відамі публіцыстычных твораў (аўтабіяграфічны нарыс); паглыбіць звесткі пра творчасць У. Караткевіча; абудзіць цікавасць да яго цыкла мастацка-этнаграфічных нарысаў «Зямля пад белымі крыламі»; развіваць творчае ўяўленне сямікласнікаў і выхоўваць пачуццё павагі да нацыянальных традыцый, звычаяў і культуры	Тэкст твора У. Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі» **Д/з**: прачытаць другі і трэці раздзелы нарысаў
47	Уладзімір Караткевіч. «Зямля пад белымі крыламі». «Просім у хату, госцейкі нашы!»	Пазнаёміць з раздзеламі «Просім у хату, госцейкі нашы!», «Хлеб і да хлеба», акцэнтаваць увагу на прадметах хатняга побыту, ежы, прыладах працы беларусаў і праз іх апісанне даць уяўленне пра лад жыцця вясковых людзей; выхоўваць пашану да спадчыны беларускага народа, гонар за сваю краіну	Тэкст твора У. Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі» **Д/з**: прачытаць чацвёрты і пяты раздзелы нарысаў
48	Уладзімір Караткевіч. «Зямля пад белымі крыламі». «Людзі зямлі беларускай»	Раскрыць асноўныя рысы і склад характару беларусаў: шчодрасць, гатоўнасць прыйсці на дапамогу ў бядзе, гасціннасць да добрых людзей, знаходлівасць, здольнасць пажартаваць з сябе; фарміраваць пачуццё нацыянальнай годнасці	Тэкст твора У. Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі» **Д/з**: вывучыць на памяць урывак з раздзела «Людзі зямлі беларускай» (на выбар вучняў ці настаўніка)
49	Урок пазакласнага чытання (можна правесці па адным з твораў, змешчаных у хрэстаматыі для	Удасканальваць уменне пераказваць мастацкі тэкст, захоўваючы сюжэт твора, адметныя вобразна-выяўленчыя сродкі, ужытыя аўтарам; вызначаць асноўныя эпізоды і характарызаваць герояў твора	Тэкст твора з хрэстаматыі для пазакласнага чытання «Вытокі» **Д/з**: прачытаць твор Л. Дайнекі «Меч князя Вячкі»

1	2	3	4
	пазакласнага чытання для вучняў 7 класа)		
50	Леанід Дайнека. «Меч князя Вячкі» (пяты раздзел — скарочана)	Пазнаёміць з уступным артыкулам «...І перанесціся ў далёкае мінулае», даць пачатковае паняцце пра творы літаратуры, якія ўзніклі на сумежжы мастацкай літаратуры і навукі, высветліць першаснае ўспрыманне твора; выхоўваць цікавасць да гістарычнага мінулага нашай краіны	Тэкст твора Л. Дайнекі «Меч князя Вячкі» і артыкула «...І перанесціся ў далёкае мінулае» **Д/з**: падрыхтаваць адказы на пытанні да твора
51	Леанід Дайнека. «Меч князя Вячкі». Характарыстыка вобразаў твора	Раскрыць характар князя Вячкі як гістарычнай асобы, патрыёта, абаронцы сваёй зямлі, як сумленнага чалавека і добрага бацькі; праз гэты вобраз і іншыя вобразы-персанажы паглыбляць веды вучняў пра гістарычную эпоху і час, калі адбывалася дзеянне; раскрыць майстэрства пісьменніка ў стварэнні вобразаў тэўтонаў, развіваць вуснае маўленне вучняў; спрыяць станаўленню пачуцця гонару за гістарычнае мінулае нашай краіны і яе знакамітых асоб	Тэкст твора Л. Дайнекі «Меч князя Вячкі» **Д/з**: знайсці гістарызмы і архаізмы і вызначыць іх ролю ў творы
52	Уладзімір Караткевіч. «Балада пра Вячку, князя людзей простых». Вобраз Вячкі	Падагульніць веды вучняў пра творчасць У. Караткевіча; выявіць першаснае ўспрыманне твора «Балада пра Вячку, князя людзей простых»; раскрыць вобраз Вячкі; параўнаць сродкі і прыёмы стварэння гэтага вобраза ў празаічным і паэтычным творах; выхоўваць гонар за айчынную гісторыю і народных герояў	Тэксты твораў Л. Дайнекі «Меч князя Вячкі» і У. Караткевіча «Балада пра Вячку, князя людзей простых» **Д/з**: падрыхтаваць выразнае чытанне твора У. Караткевіча

1	2	3	4
53	Уладзімір Караткевіч. «Балада пра Вячку, князя людзей простых». Мастацкі герой і гістарычная асоба	Параўнаць вобраз Вячкі ў паэтычным творы з вобразам Вячкі з навуковага артыкула «З мячом і крыжам»; на прыкладзе спосабаў і сродкаў паказу гэтага персанажа абагульніць веды пра адрозненне паміж мастацкай і навуковай літаратурай; спрыяць развіццю цікавасці вучняў да мастацкай і публіцыстычнай літаратуры. Падвесці вынікі вывучанага за год і даць парады для самастойнага чытання на летніх канікулах	Тэкст твора У. Караткевіча «Балада пра Вячку, князя людзей простых» і навуковага артыкула «З мячом і крыжам»

Рэкамендаваная вучэбна-метадычная літаратура

Беларуская мова

Тумаш, Г. В. Беларуская мова. 7 клас. Рабочы сшытак / Г. В. Тумаш, Л. Ф. Леўкіна. – Мінск : Аверсэв, 2012.

Бадзевіч, З. І. Пішам па-беларуску. Даведнік па арфаграфіі і пунктуацыі з каментарыямі / З. І. Бадзевіч [і інш.]. – Мінск : Аверсэв, 2010, 2011.

Слоўнікі

Бардовіч, А. М. Школьны марфемны слоўнік беларускай мовы / А. М. Бардовіч [і інш.]. – Мінск : Аверсэв, 2004, 2006.

Бардовіч, А. М. Школьны словаўтваральны слоўнік беларускай мовы / А. М. Бардовіч [і інш.]. – Мінск : Аверсэв, 2006.

Кандраценя, І. У. Беларускі арфаграфічны слоўнік для школьнікаў / І. У. Кандраценя [і інш.] ; пад рэд. А. А. Лукашанца. – Мінск : Аверсэв, 2010, 2011.

Бандарэнка, Н. Д. Разам, асобна, праз злучок. Даведнік / Н. Д. Бандарэнка [і інш.] ; пад рэд. А. А. Лукашанца. – Мінск : Аверсэв, 2011.

Беларуская літаратура

Верціхоўская, В. У. Вывучэнне творчасці Ф. Скарыны ў школе / В. У. Верціхоўская, М. І. Верціхоўская. – Мінск : Аверсэв, 2006.

Грамадчанка, Т. К. Школьныя творы : Кароткі змест і аналіз / Т. К. Грамадчанка. – Мінск : Аверсэв, 2010.

Бельскі, А. І. Сучасная літаратура Беларусі / А. І. Бельскі. – Мінск : Аверсэв, 2000.

Ішчанка, Г. М. Вывучэнне творчасці пісьменніка : У. Караткевіч у школе / Г. М. Ішчанка. – Мінск : Аверсэв, 2005.

Ляшук, В. Я. Вывучэнне творчасці пісьменніка : Іван Мележ у школе / В. Я. Ляшук. – Мінск : Аверсэв, 2006.

Ляшук, В. Я. Вывучэнне творчасці Янкі Брыля ў школе / В. Я. Ляшук. – Мінск : Аверсэв, 2004.


Ляшук, В. Я. Вывучэнне творчасці Максіма Багдановіча ў школе / В. Я. Ляшук. – Мінск : Аверсэв, 2008.

Ляшук, В. Я. Вывучэнне творчасці Максіма Танка ў школе / В. Я. Ляшук. – Мінск : Аверсэв, 2009.

Ляшук, В. Я. Вывучэнне творчасці Францыска Багушэвіча ў школе / В. Я. Ляшук. – Мінск : Аверсэв, 2009.

Выдавецтва «Аверсэв»

прапануе наступныя выданні:




Беларускі арфаграфічны слоўнік для школьнікаў

І. У. Кандраценя, Л. П. Кунцэвіч
Пад рэдакцыяй *А. А. Лукашанца*
2-е выданне

Арфаграфічны слоўнік з'яўляецца даведнікам па правільнай і аднастайнай перадачы пісьмовай мовы і прызначаны садзейнічаць засваенню школьнікамі правапісных нормаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Акрамя агульнаўжывальных слоў, у слоўнік уключаны і новыя лексічныя адзінкі, якія атрымалі пашырэнне ў сучаснай моўнай практыцы.

Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь



Пішам па-беларуску. Даведнік па арфаграфіі і пунктуацыі з каментарыямі

З. І. Бадзевіч, Г. М. Валочка, І. У. Кандраценя, Л. П. Кунцэвіч, А. А. Лукашанец


У даведніку прыводзяцца асноўныя правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі, даюцца каментарыі да гэтых правілаў, звяртаецца ўвага на найбольш складаныя выпадкі і асаблівасці беларускага правапісу. Матэрыялы кнігі могуць быць выкарыстаны ў працэсе навучання беларускай мове ва ўстановах агульнай сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі, а таксама ў час падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання.

Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

У кнігарнях рэспублікі!

Выдавецтва «АВЕРСЭВ»


прапануе наступныя выданні:



Беларуская мова. 5 клас. Рабочы сшытак

Г. В. Тумаш


11-е выданне



Беларуская мова. 6 клас. Рабочы сшытак

Г. В. Тумаш

10-е выданне




Беларуская мова. 7 клас. Рабочы сшытак

Л. Ф. Леўкіна, Г. В. Тумаш

9-е выданне

Рабочыя сшыткі з'яўляюцца неад'емнай часткай вучэбна-метадычных комплексаў па беларускай мове. Матэрыял у іх размешчаны ўадпаведнасці з паслядоўнасцю тэм падручнікаў і служыць карысным дадаткам для паспяховага авалодання мовай. Заданні і практыкаванні прапануюцца розных узроўняў складанасці, маюць творчы характар, развіваюць здольнасці вучняў.



Беларуская мова. 8 клас. Рабочы сшытак

Г. В. Тумаш

7-е выданне

Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

У кнігарнях рэспублікі!

2012/2013
навучальны год

Беларуская мова і літаратура

7 *клас*

Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне

ISBN 978-985-19-0155-1

